УДК [94(476.1)"18/19"+929Вайніловіч](082)
ББК 63.3(4Беи)я43
Б43

Серыя заснавана ў 2016 годзе

Рэдакцыйная калегія:
А. А. Каваленя (галоўны рэдактар), *Н. В. Анофранка, В. В. Даніловіч, У. М. Завальнюк, В. Л. Лакіза, Н. Я. Новік, У. С. Пуцік* (адказны рэдактар), *А. У. Унучак*

Рэцэнзент:
загадчык цэнтра ўсеагульнай гісторыі і міжнародных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук *У. В. Тугай*

Беларусь, Нясвіжскі край і Эдвард Вайніловіч : матэрыялы навук.-практ. канф., г. Нясвіж, 26 жніўня 2016 г. / Інстытут гісторыі НАН Беларусі; рэдкал.: А.А. Каваленя (галоўны рэдактар) [і інш.]. — Мінск : Медысонт, 2016. — 244 с. — (Серыя «Беларусь і Эдвард Вайніловіч»).

ISBN 978-985-7136-41-4.

У зборніку змешчаны даследаванні беларускіх навукоўцаў, спецыялістаў па гісторыі Беларусі другой паловы XIX — першай трэці XX ст., прысвечаныя выдатнай асобе, рэфарматару, патрыёту сваёй Айчыны Эдварду Вайніловічу (1847–1928), а таксама Нясвіжу і Нясвіжскаму краю. На фоне гістарычных катаклізмаў як у Беларусі, так і за яе межамі адлюстраваны важнейшыя вехі з жыцця і дзейнасці нашага земляка.

Адрасуецца вучоным, выкладчыкам ВНУ, настаўнікам школ, краязнаўцам і ўсім тым, хто зацікаўлены ў вывучэнні амаль забытых старонак з гісторыі нашай Бацькаўшчыны.

УДК [94(476.1)"18/19"+929Вайніловіч](082)
ББК 63.3(4Беи)я43

ISBN 978-985-7136-41-4

© Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2016
© Афармленне. ТАА «Медысонт», 2016

Серыя «Беларусь і Эдвард Вайніловіч»

ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАН БЕЛАРУСІ
МІЖНАРОДНЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ЭКАЛАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. Д. САХАРАВА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА
НЯСВІЖСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
РЫМА-КАТАЛІЦКІ КАСЦЁЛ У БЕЛАРУСІ

БЕЛАРУСЬ, НЯСВІЖСКІ КРАЙ І ЭДВАРД ВАЙНІЛОВІЧ

Матэрыялы
навукова-практычнай канферэнцыі

г. Нясвіж, 26 жніўня 2016 г.

Мінск
«Медысонт»
2016

участков земли; определением размера чинша; рассмотрением ходатайств крестьян, мещан и дворян о признании за ними чиншевых прав на земли в помещичьих и казенных владениях[32].

Таким образом, крестьяне Несвижского края после отмены крепостного права оказались в фарватере деятельности Минского губернского по крестьянским делам присутствия. Оно было сформировано согласно установочным документам и после реформы 1861 г. возглавило иерархию местных органов власти в деревне, являясь при этом посредником между Министерством внутренних дел и нижестоящими учреждениями по крестьянским делам. Формирование Минского губернского по крестьянским делам присутствия проходило на основе «Положения о губернских и уездных по крестьянским делам учреждениях» от 19 февраля 1861 г., в котором определялся состав и основные функции органов местной власти в деревне. Однако чёткие юридические установки, зафиксированные в документе, зачастую подлежали вынужденной корректировке, которая требовалась в процессе фактической реализации функций учреждений по крестьянским делам.

Находясь во главе иерархии сельской власти, чиновникам Минского губернского по крестьянским делам присутствия приходилось реагировать на любые ситуации в жизни пореформенной деревни, в том числе вникать и в вопросы крестьянского самоуправления. С одной стороны, это ставило крестьян в зависимость от органов местной власти, препятствуя развитию сельского самоуправления, с другой — губернские по крестьянским делам присутствия, выполняя роль попечителя по отношению к крестьянам, заботились об улучшении их быта и нередко отстаивали их интересы.

[32] НИАБ. Ф. 242. Оп. 4. Д. 1–1166.

Святлана Талмачова

ПРАБЛЕМА СЕРВІТУТУ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX — ПАЧАТКУ XX ст.

Сервітут — права сялян карыстацца ў маёнтках асобнымі ўгоддзямі для пэўных гаспадарчых патрэб. На тэрыторыі Беларусі існавалі два віды сервітутаў: пашавыя і лясныя. У сваю чаргу, пашавыя падзяляліся на аднабаковыя і ўзаемныя. Пры аднабаковых правам пасьбы жывёлы карысталіся толькі сяляне на ўладальніцкіх ўгоддзях, а пры ўзаемным такое права належала ободвум бакам, кожнаму — на ўгоддзях другога. У адпаведнасці з родам угоддзяў, на якіх ажыццяўляўся выпас жывёлы, вызначаліся сервітуты для пасьбы на палях, лугах, у лясах, а таксама па зарасніках, багнах і іншых неапрацаваных угоддзях.

Узаемнымі сервітутамі звычайна былі ворыўныя землі сялян і ўладальнікаў і толькі ў рэдкіх выпадках — лугі. Сервітутная пасьба на палях адбывалася ў той час, калі зямля была пад парам, а таксама да сяўбы і пасля збору хлеба; на лугах — увесну і пасля збору сена. На іншых угоддзях — у лясах, багнах, зарасніках і да т. п. пасьба па праве сервітуту дапускалася на працягу ўсяго пашавага перыяду. Лясныя сервітуты былі толькі аднабаковыя і заключаліся ў праве сялян на атрыманне з уладальніцкіх лясоў будаўнічых матэрыялаў, дроў і ламачча, а таксама ў праве збірання грыбоў, ягад, арэхаў і інш.[1]

[1] Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей — РДГА). Ф. 1276. Воп. 9. Спр. 472. Арк. 2-2 зв.

Акрамя названых, сустракаліся сервітуты па здабыванні сялянамі камяню, пяску і гліны, збору чароту, лоўлі рыбы, ракаў і інш. на ўладальніцкіх землях.[2]

У парэформенны перыяд падставай для карыстання сервітутамі служылі выкупныя дакументы, а ў некаторых выпадках дапаўняўшыя іх рашэнні па сялянскіх справах устаноў і судовых органаў, па скаргах бакоў на няправільныя замены ці пропускі сервітутнага права ў выкупных актах.

Права карыстання сервітутамі прадстаўлялася цэлым сельскім грамадам ці паселішчам, якія з'яўляліся юрыдычнай асобай у сервітутных адносінах. У некаторых маёнтках адным і тым жа ўгоддзем як сервітутным мелі права карыстацца некалькіх грамад, у іншых сяляне адной грамады карысталіся некалькімі падобнымі ўгоддзямі ў маёнтку. Выпадкі замацавання сервітутаў за пэўнымі асобамі адзначаліся толькі ў адносінах былых сельскіх вечных чыншавікоў, адзінаверцаў і стараабрадцаў[3].

Былыя ўладальніцкія сяляне заходніх губерняў атрымалі пазямельнае ўладкаванне на падставе Мясцовых палажэнняў 19 лютага 1861 г. для губерняў паўночна-заходніх (Віленскай, Ковенскай, Гродзенскай, Мінскай і чатырох паветаў Віцебскай) і двух беларускіх (Магілёўскай і астатніх паветаў Віцебскай)[4]. У адпаведнасці з гэтымі дакументамі сяляне паўночна-заходніх губерняў атрымалі ў надзел усе тыя сядзібныя і палявыя землі і ўгоддзі, якія былі ў іх карыстанні да 19 лютага 1861 г.

Істотным адрозненнем землеўладання ў краі з'яўлялася амаль паўсюдная цераспалосіца сялянскіх угоддзяў з уладальніцкімі, якая была значна большай, чым у іншых губернях імперыі. Яна вызначалася, з аднаго боку, у перамяжэнні дробных сялянскіх палявых палос з такімі ж памешчыцкімі,

[2] РДГА. Ф. 1276. Воп. 9. Спр. 472. Арк. 2–2 зв.
[3] РДГА. Ф. 1276. Воп. 9. Спр. 472. Арк. 2 зв.
[4] ПСЗРИ. Собр. 2-е. Т. 36. №№. 36662, 36665.

а з другога — у раскіданых сярод уладальніцкіх лясоў дробных сялянскіх сенажацяў. У названых Мясцовых палажэннях 19 лютага 1861 г. быў вызначаны шасцігадовы тэрмін, на працягу якога памешчык меў права патрабаваць абавязковага для сялян адмежавання агульных і цераспалосных з сялянамі фальваркавых угоддзяў, а таксама прадугледжваўся парадак размежавання. Але гэтыя правілы Мясцовых палажэнняў не набылі практычнага прымянення. Указамі ад 1 сакавіка, 30 ліпеня і 2 лістапада 1863 г. сяляне дзевяці заходніх губерняў былі пераведзены ў разрад сялян-уласнікаў, з пераўтварэннем устаўных грамат у выкупныя акты. Абавязковыя пазямельныя адносіны ліквідаваліся ў паўночна-заходніх губернях з 1 мая, паўднёва-заходніх — з 1 верасня 1863 г., а ў Магілёўскай і астатніх паветах Віцебскай губерні — з 1 студзеня 1864 г.[5] 1 мая 1863 г. і 5 лютага 1864 г. Аляксандр II зацвердзіў палажэнні Галоўнага гамітэта аб уладкаванні сельскага стану. У іх было ўсталявана, што канчатковае аддзяленне сялянскіх угоддзяў ад памешчыцкай зямлі павінна адбывацца на дакладным выкананні артыкула 112 Палажэння аб выкупе[6], г. зн. на падставе агульных законаў для дабрачыннага адмежавання земляў прыватных уладальнікаў, ці на падставе тых правілаў, якія будуць для гэтага выдадзены ўрадам. З гэтай прычыны ўсе артыкулы Мясцовых палажэнняў для губерняў паўночна- і паўднёва-заходніх, што тычыліся абавязковага размежавання ці абмену ўгоддзяў, згубілі сілу і значэнне. Пры гэтым дзеянне гэтых атрыкулаў не было адноўлена і пазнейшымі заканадаўчымі актамі — правіламі 26 сакавіка 1869 г.[7] і законам 30 сакавіка 1892 г.[8] У адпаведнасці з імі развярстанне ўгоддзяў у губернях Кіеўскай, Падольскай, Валынскай, Віленскай, Ко-

[5] ПСЗРИ. Собр. 2-е. Т. 38. № 39337, 39928, 40172.
[6] ПСЗРИ. Собр. 2-е. Т. 36. № 36659.
[7] ПСЗРИ. Собр. 2-е. Т. 44. № 46901.
[8] ПСЗРИ. Собр. 2-е. Т. 12. № 84733.

венскай, Гродзенскай, Мінскай і частцы Віцебскай дапускалася выключна на падставе дабрачынных пагадненняў. Між тым, такія пагадненні мелі месца толькі ў вельмі рэдкіх выпадках. З гэтай прычыны ў пераважнай большасці маёнткаў сялянам быў адведзены надзел у тых нязручных межах, у якіх яны карысталіся ім у час існавання прыгонніцтва.

Другой, яшчэ больш істотнай асаблівасцю пазямельнага ўладкавання сялян заходніх губерняў было прадстаўленне ім, разам з надзяленнем зямлёю, права сервітутнага карыстання на памешчыцкіх угоддзях. Фактычна пачатак такога карыстання адносіцца да XV ст., але ўпершыню яно было адзначана ў гаспадарчых інвентарах, складзеных на падставе ўказа Мікалая I ад 1844 г. Гэта сервітутнае карыстанне складалася галоўным чынам у праве сялян пасвіць жывёлу на памешчыцкіх угоддзях. Аднак у Палажэннях 19 лютага 1861 г. пра яго нічога не было сказана. Таму ні памешчыкамі, ні міравымі пасрэднікамі, ні губернскімі па сялянскіх справах прысутнасцямі яно не ўключалася ва ўстаўныя граматы. Такім чынам, пры складанні выкупных актаў узніклі непаразуменні як адносна сутнасці права сялян на пасьбу жывёлы на памешчыцкіх угоддзях, так і аб тым, ці трэба ўключаць гэта права ў выкупныя акты.

Для вырашэння дадзенай праблемы Віленскі генерал-губернатар М. М. Мураўёў 15 лютага і 1 ліпеня 1864 г. выдаў асобыя распараджэнні. У іх тлумачылася, што на падставе 3 артыкула Мясцовага палажэння для паўночна-заходніх губерняў ад 19 лютага 1861 г. за сялянамі замацоўваліся пашавыя сервітуты на ўладальніцкіх угоддзях, і што гэта неабходна зафіксаваць у выкупных актах[9]. Аналагічнае тлумачэнне ў дачыненні Паўднёва-Заходняга краю было зроблена 3 жніўня 1866 г. Кіеўскім, Падольскім і Валынскім генерал-губернатарам, генерал-ад'ютантам А. П. Безакам. Пазней распараджэнні М. М. Мураўёва атрымалі заканадаўчую санкцыю ў правілах 26 сакавіка 1869 г. аб адмежаванні сялянскіх надзелаў і заканчэнні паверачных работ у Паўночна-Заходнім краі[10].

[9] Сборник правительственных распоряжений по устройству быта крестьян-собственников в Северо-Западном крае. Вильна, 1864. С. 102–105, 138–140.

У адпаведнасці з артыкуламі IV аддзела названых правілаў, «право пастьбы на землях и в лесах помещиков (сервитут), будучи утверждено за крестьянами в силу статьи 3 Местного положения 19 февраля 1861 г. и статьи 1 указа 1 марта 1863 г., не может быть отменяемо иначе, как с соразмерным за оное вознаграждением крестьян, а впредь до издания подробных о сем правил, прекращение права пастьбы может последовать только по добровольным между помещиками и крестьянами соглашениям»[11].

Па правілах 26 сакавіка 1869 г., пашавы сервітут можна было ліквідаваць толькі ў выпадку дабрачыннага пагаднення паміж памешчыкам і сялянамі. Пры гэтым міравыя пасрэднікі павінны былі назіраць, каб не былі парушаны правы казны, якая разглядала ўсю сукупнасць зямель і ўгоддзяў, што знаходзіліся ў карыстанні сялян, у тым ліку і сервітуты, у якасці залогу своечасовага пагашэння выкупной пазыкі. Такім чынам, урад быў зацікаўлены ў ахове эканамічных інтарэсаў сялян. Да дваранства ўлада ставілася ў гэты час яшчэ вельмі насцярожана і не была зацікаўлена ў павышэнні яго дабрабыту. Таму ў пэўных выпадках гаспадарчыя інтарэсы сялян задавальняліся за кошт памешчыкаў.

На мясцовыя ўстановы па сялянскіх справах ускладаўся абавязак замацаваць (з унясеннем у выкупныя дакументы) за сялянамі ўсё тое, чым яны карысталіся да адмены прыгону на землях і ў угоддзях памешчыкаў, у тым ліку і розныя віды пашавых сервітутаў. Аднак паверачныя камісіі, якія займаліся

[10] ПСЗРИ. Собр. 2-е. Т. 44. № 46901.
[11] ПСЗРИ. Собр. 2-е. Т. 44. № 46901.

высвятленнем, удакладненнем і выпраўленнем устаўных гра-
мат, не заўсёды дакладна вызначылі ў дакументах такія ўгод-
дзі[12]. Прычын такога становішча было некалькі.

Па-першае, паверачныя работы праводзіліся ў шэрагу
выпадкаў у спешным рэжыме. Напрыклад, па сцвярджэнні
Віленскага генерал-губернатара А. Л. Патапава, «в Гроднен-
ской губернии, в коей работы сии производились особенно по-
спешно и официально названы были оконченными в 1864 г.,
в настоящее время [у 1868 г. — С. Т.], хотя выданы крестьянам
данныя по 2000 имениям, но отграничение их надела в натуре
сделано только в 150 имениях, и эта медленность главнейше
зависит именно от несходства выкупных актов с действитель-
ным крестьянским владением»[13].

Па-другое, некаторыя камісіі былі недастаткова кампе-
тэнтнымі ў вырашэнні такога пытання, таму што пераважная
ная большасць членаў паверачных камісій была выкліканая
з унутраных губерняў Расійскай імперыі, дзе ўвогуле ніколі
не існавала такога паняцця як «сервітутнае права», што было
адной з асаблівасцей аграрных адносін у Паўночна-Заходнім
краі. Так, Віленскі генерал-губернатар А. Л. Патапаў у чэрвені
1868 г. у адозве да Міністра ўнутраных спраў адзначаў: «При
смене, во время вооруженнаго мятежа, всех прежних мировых
посредников из местных дворян-помещиков, некогда и нель-
зя было быть разборчивым в сформировании новаго состава.
Естественно, что личный состав поверочных комиссий и вооб-
ще мировых учреждений набран был весьма разнокалиберный
и неподготовленный к делу. При таком составе, вместо назна-
чения каждому точно ограниченнаго законом места и круга

[12] *Войниллович Э. А.* Об упразднении пастбищных сервитутов и уничтоже-
нии черезполосности крестьянских земель с фольварковыми в западных
губерниях : Записка Э. А. Войнилловича, [вице-пред. Мин. о-ва сел. хоз-
ва]]. Минск, ценз. 1899. С. 4–5.

[13] РГИА. Ф. 1291. Воп. 33, 1868 г. Спр. 34. Арк. 38.

действий, сделано было им лишь общее воззвание к политиче-
ской деятельности и к водворению русских начал, без всякого
разумнаго указания им меры и согласования их действий. ...
При разнокалиберности и неподготовленности личного состава,
при отсутствии инструкций, надзора и согласования свыше,
произошли крайнее разнообразие и произвольность действий
низших исполнительных инстанций, ведение каждым дела по
своей личной мерке, допускавшее в некоторых полный простор
необдуманности и увлечений, в особенности при шаткости и
эластичности заменивших закон административных правил
местной власти».[14]

Па-трэцяе, у шэрагу выпадкаў правы сялян на пасьбу жы-
вёлы не былі вызначаны дакладна. Ні ў рашэннях устаноў па
сялянскіх справах, ні ў выкупных дакументах не прыводзіла-
ся колькасць наяўнай сялянскай жывёлы, ці колькасць галоў
жывёлы, якую сяляне мелі права выпускаць на выпас, але па
большасці маёнткаў не былі вызначаны межы тэрыторыі, на
якую распаўсюджвалася сервітутнае права. У большасці вы-
падкаў указвалася, што сялянам прадстаўляецца права пасьбы
жывёлы «по-старому», «по-прежнему» і да т. п. Так, па даных
МУС, у Мінскай губерні такіх маёнткаў налічвалася звыш
90 % ад усёй колькасці маёнткаў з сервітутамі[15]. Пры гэтым
па даных кіраўніка Мінскай казённай палаты Ф. Ястрэмскага,
па выкупных актах у Мінскай губерні сервітутнае права было
замацавана за 59,2 % сялянскіх двароў. У Мінскім, Навагруд-
скім, Слуцкім і Ігуменскім паветах — ад 64,7 да 88,5 % двароў,
у Барысаўскім — 15,7 % двароў, а ў астатніх 4-х паветах — ад 49
да 58,5 % надзельных двароў[16].

[14] РГИА. Ф. 1291. Воп. 33, 1868 г. Спр. 34. Арк. 3 зв.–5.

[15] Краткая история вопроса о сервитутах и общие соображения о ликвида-
ции сервитутных отношений. — [СПб., 1910]. С. 19.

[16] Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышлен-
ности : в 58 т. Т. 21: Минская губерния. СПб., 1903. С. 24.

Распараджэннямі М. М. Мураўёва ад 15 лютага і 1 ліпеня 1864 г. прадпісвалася, што ў выкупных актах павінны быць акрэслены «мясцовасці», на якія распаўсюджваліся сервітутныя правы. Гэты выраз паверачнымі камісіямі разумеўся ў шырокім дыяпазоне. Таму ў выкупных актах сервітутнае права вызначалася вельмі нявыразна: «по лесам помещика», «по-прежнему в лесах владельца», «в одну сторону от деревни на столько-то верст», «в прилегающих к наделу угодьях», «в таких-то урочищах» і да т. п. Па законе ад 26 акавіка 1869 г. пры размежаванні надзельных зямель мясцовыя ўстановы па сялянскіх справах былі абавязаны дакладна вызначыць і ўказаць канкрэтна тую тэрыторыю, на якой быў зацверджаны за сялянамі пашавы сервітут. Аднак у большасці выпадкаў ні зацікаўленыя бакі, ні названыя ўстановы не скарысталі магчымасць удакладніць сервітутныя адносіны. З гэтай прычыны ў значнай колькасці выкупных дакументаў не былі паказаны ні дакладныя межы, ні колькасць дзесяцін сервітутных пашаў. Так, па звестках Міністэрства ўнутраных спраў, у Мінскай губерні з агульнай колькасці 1 882 пашавых сервітутаў толькі па 135 (каля 7 %) у дакументах былі дакладна вызначаны плошча і межы сервітутных угоддзяў[17].

Акрамя таго, у некаторых выпадках права «пасьбы па лясах» прадстаўлялася сумесна сялянам некалькіх паселішчаў без вызначэння кожнаму з іх асобных пашаў. Такая нявызначанасць сервітутных адносін перш за ўсё адмоўна ўплывала на рацыянальнае вядзенне сельскай і лясной гаспадаркі ва ўладальніцкіх маёнтках. Па-першае, пры замацаванні за сялянамі права пасьбы жывёлы «па лясах і балотах» без вызначэння іх граніц уладальнік быў абмежаваны ў сваім праве ўласнасці на ўсім маёнтку і нават у тых яго частках, дзе фактычна сяляне сваёй жывёлы ніколі не пасвілі, і дзе, уласна кажучы, не было

[17] Краткая история вопроса о сервитутах... С. 73–74.

сервітуту. Да пачатку XX ст. уладальнік не мог ні пераўтварыць некаторыя лясныя ўчасткі ў іншы від угоддзяў, ні прадаць частку маёнтка сялянам пры пасрэдніцтве Сялянскага банка. Уладальнік павінен быў прадставіць пасведчанне з губернскай прысутнасці аб тым, што плануемая пад расчыстку ці для продажу плошча не «обременена сервитутом». У сваю чаргу, губернская прысутнасць пры ўказаных умовах не мела права выдаць такое пасведчанне. Па-другое, нявызначанасць сервітутнага права з'яўлялася адной з галоўных прычын абвастрэння адносін сялян з памешчыкамі з-за пастаяннага павелічэння патрэбнасці сялян у пашах. У сваю чаргу, землеўладальнік імкнуўся скараціць прастору сервітутаў і пашырыць плошчу культурных угоддзяў за кошт лясоў і багнаў. Па-трэцяе, у выпадку прадстаўлення сервітутных правоў на пашы для некалькіх вёсак гаспадар быў пазбаўлены магчымасці заключаць здзелкі аб ліквідацыі сервітутаў з асобнымі паселішчамі, таму што заключэнне такога пагаднення не пазбаўляла жыхароў астатніх вёсак права на ўсю плошчу сервітутнай прасторы[18].

У пачатку XX ст. ужо немагчыма было ўстанавіць, на якой дакладна частцы памешчыцкай зямлі сяляне карысталіся вызначанымі сервітутамі ў час выхаду на выкуп. Пры такіх умовах узнікалі праблемы пры вызначэнні кампенсацыі сялянам пры іх ліквідацыі, як таго патрабаваў закон ад 26 сакавіка 1869 г.[19] Гэтым тлумачыцца, з аднаго боку, вялікая разнастайнасць прапанаваных у свой час мясцовымі ўстановамі спосабаў і ўмоў ліквідацыі сервітутаў, а з другога — тое, што, нягледзячы на шматгадовую распрацоўку пытання, яно так і не было канчаткова вырашана на заканадаўчым узроўні.

Так, Э. А. Вайніловіч адзначаў, што на Палессі сяляне, якія карысталіся правам пасьбы на агромністай прасторы ўладаль-

[18] Краткая история вопроса о сервитутах... С. 74.
[19] Краткая история вопроса о сервитутах... С. 19.

ніцкіх лясоў і багнаў, утрымоўвалі з камерцыйнымі мэтамі значна большую колькасць жывёлы, чым былі ў стане пракарміць узімку сенам, што збіралі з адведзеных ім у надзел лугоў. З гэтай прычыны, па яго меркаванні, забяспечваць сялянам выпас усёй іх жывёлы за кошт памешчыка было б несправядліва[20].

Трэба адзначыць, што з'яўленне права пашавага сервітуту было выклікана жаданнем землеўласнікаў прыцягнуць сялян на свае землі. У больш позні час гэта права прымалася пад увагу памешчыкамі і ўплывала на памер і склад угоддзяў сялян, паселеных на памешчыцкіх землях. Пасля далучэння тэрыторый заходніх губерняў да Расійскай імперыі, калі істотнай неабходнасці ў названых ільготах ужо не было, памешчыкі, тым не менш, не аднялі ў сялян сервітутных пашаў, хаця мелі для гэтага поўную магчымасць. Такім чынам, па-першае, сервітутныя пашы да 1861 г. былі неабходным дапаўненнем да сялянскіх угоддзяў і мелі істотнае значэнне для гаспадарчага дабрабыту сялянства. Па-другое, сервітутныя плошчы вызначаліся выключна для выпасу такой колькасці жывёлы, якую сяляне маглі ўтрымоўваць на зімовым корме, атрыманым з угоддзяў, прадстаўленых у іх карыстанне памешчыкам. Гэта азначае, што і ў выкупных актах, дзе былі зафіксаваны сервітуты, меўся на ўвазе менавіта такі аб'ём, якім карысталіся сяляне да адмены прыгону. Пазней з-за недакладнасці і непаўнаты запісаў у выкупных дакументах і адсутнасці ўказання ў іх колькасці галоў сялянскай жывёлы, якая пасвілася да 1861 г. на ўладальніцкіх угоддзях, сяляне фактычна значна пашырылі сваё права. У пачатку XX ст. на сервітутных прасторах яны пасвіліся неабмежаваную колькасць не толькі сваёй жывёлы, але нярэдка і чужой[21]. Землеўладальнікі ж гублялі магчымасць прыбытку. Так, па звестках МУС, у пачатку XX ст. на тэрыторыі Белару-

[20] *Войниллович Э. А.* Об упразднении пастбищных сервитутов... С. 4–5.

[21] Краткая история вопроса о сервитутах... С. 49–50.

сі за выпас адной галавы жывёлы звычайна бралася ад 10 да 50 кап., вельмі рэдка да 1 руб., а ў маёнтках з сервітутамі за выпас плацілі толькі некаторыя вольныя арандатары і, галоўным чынам, яўрэі, якія жылі ў паселішчах і заўсёды мелі магчымасць пасвіць сваю жывёлу разам з сялянскай, а калі найменш выпас у ўладальнікаў, то па самых нізкіх цэнах[22]. З гэтай прычыны пры спробе памешчыка ліквідаваць сервітут сяляне рашуча выказваліся супраць, не жадаючы пазбавіцца дадатковага прыбытку.

Па даных, прыведзеных вядомым даследчыкам А. В. Палонскім, у канцы 80-х гг. XIX ст. «из числа 7895 имений Виленской, Ковенской, Гродненской, Минской и четырех уездов Витебской губернии "обременены" сервитутами 2446, из них на 1 января 1890 г. в 438 имениях между помещиками и крестьянами были достигнуты "добровольные" соглашения о замене сервитутов. При этом по трем губерниям — Виленской, Гродненской и Ковенской из 1167 имений (в которых выкупными актами крестьянам было предоставлено право на пастбищные сервитуты) соглашение о замене сервитутов было "достигнуто" в 120 имениях».[23] Гэта складала толькі 10,3 % ад іх агульнай колькасці.

Для палягчэння такіх здзелак 30 сакавіка 1892 г. быў выдадзены закон, у адпаведнасці з якім дабрачынныя пагадненні аб ліквідацыі пашавых сервітутаў дазвалялася заключаць па прыгаворах, зацверджаных большасцю дзвюх трэціх колькасці сялян, а не адзінагалосна, як было раней[24]. Але гэтая мера не прывяла да чакаемых вынікаў. Дабрачынныя здзелкі заставаліся такімі ж рэдкімі, як і аб размежаванні ўгоддзяў.

[22] Краткая история вопроса о сервитутах... С. 53.

[23] *Полонский А. В.* Отношение царского правительства к вопросу о пастбищных сервитутах в Белоруссии // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1961. Рига, 1963. С. 458

[24] ПСЗРИ. Собр. 2-е. Т. 12. № 84733.

У канцы XIX ст. у Мінскай губерні, па даных МУС, з агульнай колькасці ўладальніцкіх маёнткаў (2 335) «сервитутом обременены» 1 036 (44 %), і толькі ў 87 маёнтках сервітуты былі ліквідаваны. У інфлянцкіх паветах Віцебскай з 395 маёнткаў сервітутныя адносіны існавалі ў 243 маёнтках, што складала 61 %, і ў 65 маёнтках былі ліквідаваны[25]. Адначасова ў Віленскай губерні з 5 446 маёнткаў сервітуты захаваліся ў 2 449 (44,9 %)[26]. Такія лічбы даюць падставы не пагадзіцца са сцвярджэннем А. В. Палонскага, што «царские власти шли навстречу местным помещикам, которые со второй половины 60-х годов повсеместно стали добиваться полного уничтожения всех видов сервитутов».[27]

Па даных Галоўнага упраўлення землеўладкавання і земляробства, у 1911 г. у губернях Паўночна-Заходняга краю (без даных па Магілёўскай губ.) сервітутамі былі абцяжараны 29,7 % маёнткаў. Калі ж выключыць з падлікаў даныя па Ковенскай губ., дзе была найменшая ўдзельная вага маёнткаў з сервітутамі (12,5%), то карціна становіцца яшчэ больш уражлівай — 34,2 % маёнткаў. Так, у Віленскай губ. сервітутамі карысталіся 1 810 грамад у 608 маёнтках з 2 088, у Гродзенскай — 729 грамад у 413 з 1 432, у Мінскай — 1 540 грамад у 969 з 2 365, у Віцебскай — 142 грамады ў 157 маёнтках з 393[28].

Адмоўны ўплыў сервітутаў на сельскагаспадарчае развіццё праявіўся адразу пасля пераўтварэння ўстаўных грамат у выкупныя акты. Непазбежныя вынікі пашавых сервітутаў разумеў сам М. М. Мураўёў, па распараджэнні якога права пасьбы жывёлы было замацавана за сялянамі па выкупных дакументах. Акрамя гэтага, у адозве ад 19 жніўня 1864 г. Кіеўскі генерал-губернатар М. М. Аненкаў адзначыў неабходнасць правядзення абавязковага размежавання дзеля ўладкавання ўзаемных пазямельных адносін сялян і памешчыкаў. Пазней неабходнасць абавязковага развярстання прызнаў і М. М. Мураўёў. З гэтага часу абодва пытанні распрацоўваліся на працягу амаль 30 гадоў мясцовымі ўладамі і вышэйшымі дзяржаўнымі ўстановамі. У прыватнасці, 13 лютага 1891 г. Аляксандр III зацвердзіў журнал Асобай нарады пад старшынствам Міністра ўнутраных спраў. Нарада прызнала непарыўную сувязь паміж ліквідацыяй сервітутаў і развярстаннем угоддзяў. Было адзначана, што абавязковую замену сервітутаў у заходніх губернях неабходна ажыццяўляць адначасова з дзяржаўным межаваннем зямель памешчыцкіх і сялянскіх зямель, для чаго павінны былі выдадзены асобныя правілы. Па меркаванні Асобай нарады, абавязковая адмена сервітутаў была адкладзена да выдання новага межавога статута, якое чакалася ў хуткім часе[29]. Аднак заканадаўчае зацвярджэнне межавога статута было адкладзена на нявызначаны тэрмін. Між тым, пашавыя сервітуты і цераспалосіца ўгоддзяў з'яўляліся крыніцай пастаянных аграрных непаразуменняў і спрэчак паміж сялянамі і памешчыкамі, што абвастрала іх узаемаадносіны. Адначасова сервітуты стрымлівалі інтэнсіфікацыю сельскагаспадарчай вытворчасці і лясной гаспадаркі.

У канцы XIX ст. Сенат тлумачыў, што калі ў Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і частцы Віцебскай губернях пры адмежаванні сялянскага надзелу ў выкупных дакументах не ўказаны межы пашавага сервітуту, а таксама не апісаны азначаныя межы, як таго патрабавалі правілы 26 сакавіка 1869 г., то такое «упущение» павінна было быць выпраўлена сялянскімі ўстановамі і пасля зацвярджэння губернскай прысутнасцю дакументаў па адмежаванні (указ 29 лістапада 1899 г., № 6118)[30].

[25] РГИА. Ф. 1149. Воп. 13, 1900 г. Спр. 82. Арк. 152 зв.

[26] Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности : в 58 т. Т. 4: Виленская губерния. 1903. С. 41.

[27] *Полонский А. В.* Отношение царского правительства к вопросу о пастбищных сервитутах в Белоруссии // Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы 1961. — Рига, 1963. С. 458.

[28] РГИА. Ф. 1276. Воп. 9. Спр. 472. Арк. 3.

[29] Краткая история вопроса о сервитутах... С. 3–4.

[30] Краткая история вопроса о сервитутах... — С. 75.

Такім чынам, у названых губернях справы аб усталяванні да-
кладных межаў і прасторы пашавых сервітутаў разглядаліся
ў мясцовых установах па сялянскіх справах. Тым не менш для
бакоў прадстаўлялася магчымасць звяртацца з патрабаваннямі аб усталяванні плошчы і межаў пашавых сервітутаў у судовыя ўстановы. Аднак судовы працэс быў вельмі складаны з-за шматлікіх фармальнасцей і звычайна звязаны са значнымі выдаткамі, непасільнымі не толькі для сялян, але і для памешчыкаў. Таму судовыя працэсы аб межах і плошчы сервітутных пашаў узнікалі параўнальна рэдка.

Па меркаванні МУС, губернскія па сялянскіх справах прысутнасці маглі вызначыць памер кампенсацыі сялянам пры ліквідацыі сервітутаў толькі ў тым выпадку, калі быў праведзены кадастр зямель. Але яго проста не існавала. Гэтак жа не маглі прымяняцца і існаваўшыя ў заходніх губернях ацэнкі зямель для спагнання дзяржаўнага падатку і земскіх збораў па прычыне таго, што яны складаліся па розных сістэмах не толькі ў кожнай губерні, але нават і ў асобных паветах. З-за гэтага ў адных паветах колькасць разрадаў угоддзяў даходзіла да 65 (Гродзенскі), а ў іншых абмяжоўвалася трыма (Віцебская губерня). Ацэнка лясных угоддзяў праводзілася не па якасці глебы, а па кошце лесу, які там рос. Увогуле названыя ацэнкі, як вызначаныя для іншых мэт, не выражалі ні сапраўднага кошту розных відаў зямельных угоддзяў, ні правільных суадносін паміж імі па якасці і вытворчасці глебы[31].

Па водзывах мясцовых устаноў па сялянскіх справах і службовых асоб, умовы дабрачынных здзелак аб ліквідацыі сервітутаў былі вельмі разнастайныя. Да таго ж, спецыяльныя пашы, якія ўвайшлі ў склад сялянскага надзелу, у многіх выпадках да пачатку XX ст. згубілі сваё прамое прызначэнне і былі пераўт-

[31] Краткая история вопроса о сервитутах...С. 55–56.

вораны ў ворыва ці сенажаць[32]. Гэта зразумела, таму што такія землі прыносілі больш прыбытку, чым пашы.

Мінская губернская па сялянскіх справах прысутнасць прывяла наступныя меркаванні адносна кампенсацыі за сервітут сялянам з зямель памешчыка: «Не подлежит никакому сомнению, что помещичьи хозяйства не только Минской губернии, но и всего Северо-Западного края стоят гораздо выше крестьянских. В особенности этот вывод применим к скотоводству, которое, при довольно высоких ценах на молочные продукты, в последние десять лет сделало значительный шаг вперед. А потому, если в отношении потребности пастбищ крестьянские хозяйства будут поставлены хотя относительно, но в те же условия, в которых находятся хозяйства помещиков, тогда и вопрос об обеспечении крестьян пастбищем взамен упраздняемого сервитута будет разрешен в удовлетворительном смысле. В помещичьих имениях Минской губернии почти повсеместно трехпольная система хозяйства уступила место четырехпольной со следующим севооборотом: 1-е поле — озимь, 2-е — яровое, 3-е — черный пар и 4-е — пастбище. Из этого последнего до 1/3 части всегда засевается клевером, а следовательно, лишь 2/3 четвертого поля или 1/6 всех пахотных полей остается собственно для пастбища. С присоединением к этому пастьбы скота на лугах, по скошении сена, получается полное и совершенно достаточное количество подножного корма для помещичьего скота, всегда более крупного, нежели скот крестьянский»[33]. У выніку Мінская губернская па сялянскіх справах прысутнасць прызнала дастатковым адвесці і для сялян, замест пашавага сервітуту, прастору пашы, роўную 1/6 адведзенай ім у надзел ворыўнай зямлі. Пры гэтым сялянская жывёла будзе забяспечана пашай на аднолькавых правах,

[32] Краткая история вопроса о сервитутах... С. 58.

[33] *Войниллович Э. А.* Об упразднении пастбищных сервитутов... С. 8.

што і жывёла памешчыцкая. Азначаны разлік у галоўных яго падставах прызнаны быў з сельскагаспадарчага пункту гледжання правільным[34].

У складзенай віцэ-старшынёй Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі Э. А. Вайніловічам 25 студзеня 1899 г. запісцы па пытанні аб ліквідацыі сервітутаў прапанавалася разлічваць прырэзку ў дачыненні не да адных толькі ворыўных палёў, а да ўсёй зручнай зямлі, што складала сялянскі надзел. На думку Мінскай губернскай па сялянскіх справах прысутнасці, гэта было справядліва, калі прыняць ва ўвагу пасьбу жывёлы не толькі на 2/3 чацвёртага поля, але і на лугах. Такім чынам, і па гэтым разліку пастаянныя суадносіны паміж пашай і астатнімі ўгоддзямі ўсталёўвалася як 1 да 6, ці, іншымі словамі, у кожнай гаспадаркі паша павінна была складаць 15 % усіх зручных угоддзяў[35].

Пры вырашэнні пытання аб сервітутах узнікалі і пытанні іншага характару. Акрамя розных відаў пашавага сервітуту, сялянам у некаторых выпадках былі прадстаўлены па выкупных дакументах таксама агульныя з памешчыкам выганы і пашы. Паміж правам сялян на карыстанне «обремененными пастбищными сервитутами пространствами», з аднаго боку, і агульнымі пашамі і выганамі — з другога, існавала карэннае адрозненне. У прыватнасці, на сервітутных прасторах сялянам прадстаўляўся толькі права выпасу жывёлы, права ж уласнасці на гэтыя прасторы поўнасцю належала ўладальніку. Агульныя ж выганы і пашы з'яўляліся, адпаведна, агульнай уласнасцю памешчыка і сялян. Аднак вельмі важны для вызначэння правоў бакоў тэрмін «общее пастбище», на жаль, не заўсёды выкарыстоўваўся ў выкупных дакументах з неабходнай у такіх выпадках дакладнасцю. Заканадаўча не была ўсталявана розніца паміж агульнымі пашамі і сервітутным карыстаннем.

[34] *Войниллович Э. А.* Об упразднении пастбищных сервитутов... С 8–9.
[35] *Войниллович Э. А.* Об упразднении пастбищных сервитутов... С. 8–12.

З гэтай прычыны зусім розныя па сутнасці паняцці «общее» ці «общее с помещиком пастбище», з аднаго боку, і «общая пастьба крестьян с помещиком» ці «право общей пастьбы с помещиком в лесу», з другога — часта выкарыстоўваліся ў выкупных дакументах аднолькава адно замест іншага і не заўсёды выражалі тыя правы, якія на самой справе былі прадстаўлены сялянам. У выніку былі выпадкі, калі агульныя пашы памешчыка і сялян па тэрміналогіі выкупных дакументаў былі аднесены да разраду «обремененного пастбищным сервитутом пространства» і, наадварот, плошчы пад сервітутамі названы агульнымі пашамі. Наяўнасць такіх памылак у выкупных дакументах адзначалася ў адозвах мясцовых службовых асоб і устаноў па сялянскіх справах[36]. У сваю чаргу, падобныя недакладнасці прыводзілі да канфліктаў паміж бакамі. Такім чынам, нявызначанасць юрыдычных паняццяў і недастатковая кампетэнтнасць асабовага складу ўстаноў па сялянскіх справах у 60-я гг. XIX ст. стала прычынай узнікнення складаных зямельных спрэчак паміж сялянамі і памешчыкамі ў канцы XIX — пачатку XX ст.

Трэба адзначыць, што існаванне сервітутаў мела не толькі эканамічныя, але і палітычныя наступствы. Так, у канцы XIX ст. Міністэрства ўнутраных спраў адзначала, што «неуважение к чужой собственности, в особенности же к собственности помещиков, всего более замечается именно в губерниях западного края». У МУС лічылі, што існаванне сервітутаў не ішло на карысць землеўладальнікам «польскага» паходжання, якіх у краі была пераважная большасць: «...Естественно, поэтому, что интересы местнаго, в большинстве русскаго, православного крестьянского населения имели преобладающее значение в глазах правительственной власти. Но переходившее, особливо в прежнее время, нередко за пределы справедливости

[36] Краткая история вопроса о сервитутах... С. 82–83.

покровительственное отношение органов местной администрации к крестьянам, содействуя, быть может, ослаблению в крае польского землевладельческого элемента, не могло не возыметь, в известной степени, и развращающаго влияния на сельское население западных губерний, приучая его к мысли о возможности безнаказанно нарушать права частных землевладельцев, что, в свою очередь, в настоящее время неблагоприятно отражается на условиях жизни и хозяйства поселившихся в крае русских помещиков»[37].

Міністэрства ўнутраных спраў прызнала неабходным прыступіць да вырашэння пытання аб абавязковай ліквідацыі пашавых сервітутаў і развярстанні ўгоддзяў, не чакаючы дзяржаўнага межавання ў Заходнім краі. З гэтай мэтай у 1899 г. быў складзены праект адпаведных правілаў і разасланы на заключэнне мясцовых устаноў і службовых асоб. На падставе атрыманых ад іх звестак зноў праект быў перапрацаваны і адпраўлены на абмеркаванне створанай у 1903 г. міжведамаснай нарады з удзелам мясцовых службовых асоб і грамадскіх дзеячаў.

Нарадай быў выпрацаваны праект «Правил о разверстании крестьянских надельных и владельческих чересполосных угодий, упразднении пастбищных и лесных сервитутов и разделе общих выгонов, пастбищ, водопоев в губерниях Виленской, Ковенской, Гродненской, Киевской, Подольской, Волынской и Минской и в Инфляндских уездах Витебской губернии». Аднак у сувязі са зменамі ва ўнутранай палітыцы праект не атрымаў далейшага развіцця да 1909 г., калі пры МУС была створана новая Міжведамасная нарада па пытанні аб ліквідацыі сервітутных адносін у Заходнім краі. На нарадзе 1909 г. праект аб адмене сервітутаў быў значна перапрацаваны, а затым прадстаўлены на абмеркаванне ў Дзяржаўную думу, але

[37] РГИА. Ф. 1149. Воп. 13, 1900 г. Спр. 82. Арк. 153–153 зв.

не зацверджаны[38]. Аднак і ў 1913 г. чарговы праект «Правил», адобраны ў Савеце міністраў, так і не набыў сілу закона. Рэалізацыя Сталыпінскай аграрнай рэформы прадугледжвала развярстанне зямель, ліквідацыю цераспалосіцы і сервітутаў. Гэта было абавязковай умовай пры стварэнні хутарскіх і адрубных гаспадарак. У выніку практыка апераджала юрыдычнае забеспячэнне вырашэння сервітутных праблем.

У прадстаўленні адзначалася, што «чересполосность крестьянских надельных земель с частновладельческими, и в особенности некоторые из укрепленных за крестьянами сервитуты, с одной стороны, крайне обостряют взаимные поземельные отношения между крестьянами и частными владельцами, а с другой — затрудняют правильное ведение сельского хозяйства как на крестьянских, так и на владельческих землях, и что, как это показал опыт, нельзя ожидать устранения указанных неудобств землепользования путем добровольных соглашений, представляется необходимым принять решительные меры к обязательному упразднению вредных в сельско-хозяйственном отношении чересполосности и общности угодий и сервитутов...»[39]

Такім чынам, распараджэнні М. М. Мураўёва аб аднаўленні сервітутнага права ў Паўночна-Заходнім краі былі скіраваны для прыцягнення на бок урада сялянства Беларусі і падрыў эканамічнага стану «польскага» дваранства. Гэтыя задачы былі выкананы. Аднак меры, якія разглядаліся у якасці часовых, мелі больш шырокія наступствы. Па-першае, слабае і недастатковае валоданне міравых пасрэднікаў і чыноўнікаў, якія ўваходзілі ў склад паверачных камісій, а таксама ў склад мясцовых губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, сутнасцю пытання аб сервітутах. Гэта, з аднаго боку, прывяло да дваістасці ў вызначэнні тэрміналогіі «сумеснае ўладан-

[38] Краткая история вопроса о сервитутах... С. 4–5.

[39] Краткая история вопроса о сервитутах... С. 5–6.

не» і «сервітут». З другога боку, у выкупных дакументах не былі дакладна вызначаны плошча, межы і ўмовы карыстання сервітутам, у прыватнасці, пашавым. У выніку сяляне імкнуліся пашырыць магчымасці максімальна выкарыстоўваць сваё права карыстання сервітутнымі землямі, што часта мела негатыўныя наступствы для экалогіі рэгіёна (напрыклад, немагчымасць аднаўлення лясоў новымі насаджэннямі). У сваю чаргу, памешчыкі імкнуліся абмежаваць правы сялян і адстаяць свае. Падобнае сутыкненне інтарэсаў прыводзіла да канфліктаў. І калі у 60-я гг. XIX ст. варожыя адносіны сялян да землеўладальнікаў-католікаў пэўным чынам задавальнялі інтарэсы мясцовай адміністрацыі, то з цягам часу гэта стала непакоіць урад. Такім чынам, па-трэцяе, існаванне сервітутаў перашкаджала распаўсюджанню ў краі «рускага землеўладання». Пры гэтым, па сутнасці, пытанне аб ліквідацыі сервітутаў можна было вырашыць на заканадаўчым узроўні. Так, адразу было ліквідавана права сервітутнага карыстання пры землеўпарадкаванні ў дзяржаўных і канфіскаваных маёнтках. З дваранскім землеўладаннем становішча было больш складаным. З аднаго боку, пасля падаўлення паўстання ўжо не было неабходнасці ў рэалізацыі новых эканамічных санкцый у адносінах да «польскага» дваранства, а «рускіх» землеўладальнікаў і так было адносна няшмат. З другога боку, урад апасаўся процідзеяння сялян спробам адняць у іх землі, карыстанне якімі разглядалася сялянствам натуральным. Падобныя крокі ўрада маглі прывесці да сацыяльнага выбуху. Таму на працягу дзесяцігоддзяў пытанне аб ліквідацыі сервітутаў так і не было вырашана. З пачаткам рэалізацыі Сталыпінскай аграрнай рэформы і дзеяннем землеўпарадкавальных камісій справа пачала вырашацца на ўзаемавыгадных для ўсіх бакоў умовах.

Уладзімір Пуцік

СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫЯ ТАВАРЫСТВЫ ЯК АСЯРОДАК ПРАГРЭСІЎНАЙ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЙ І ПАЛІТЫЧНАЙ ДУМКІ Ў ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНІМ КРАІ

Пачатак XX ст. у Расійскай імперыі характарызуецца бурным індустрыяльным развіццём на аснове прадпрымальніцтва, прыцягненнем у прамысловасць і на транспарт наёмнай працы, будаўніцтвам буйных прадпрыемстваў. Па тэмпах росту прамысловасці Расія апярэджвала вядучыя краіны свету. За дваццацігадовы перыяд (напярэдадні Першай сусветнай вайны) сярэднегадавы прырост валавога нацыянальнага прадукту ў Расіі быў вышэйшы, чым у краінах Заходняй Еўропы.

Разам з тым, «самая дзікая вёска» тармазіла развіццё расійскай эканомікі, параджала вострыя сацыяльна-эканамічныя канфлікты. Хуткі рост насельніцтва, у першую чаргу сельскага, зводзіў на нішто ўсе поспехі індустрыялізацыі. Па вытворчасці прадукцыі на душу насельніцтва Расія стаяла на адным з апошніх месц у Еўропе.[1]

Па ўзроўні адукацыі Расійская імперыя ўваходзіла ў тройку самых адсталых краін Еўропы і займала па гэтым адмоўным паказчыку трэцяе месца пасля Румыніі і Сербіі. Па колькасці непісьменных навабранцаў Расію апярэджвала толькі Румынія (690 непісьменных на кожныя 1000 навабранцаў).

[1] Россия в начале XX века / под ред. акад. А. Н. Яковлева. М.: Новый хронограф, 2002. С. 37.